Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(57), 2009

*УДК [947 + 943.0 + 943.8] “1922.04.16”*

# Падпісанне рапальскага дагавора і рэакцыя польскай дыпламатыі

М. М. Мязга

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пры фарміраванні Версальскай сістэмы міжнародных адносін Расія і Германія аказаліся ў ролі краін-ізгояў. З другога боку, Польшча з’яўлялася краінай, якая сваёй назалежнасцю была ў многім абавязана менавіта Версальскаму дагавору. Рознае стаўленне названых краін да Версальскай сістэмы абумовіла тыя ўзаемаадносіны, якія паміж імі фарміраваліся. Імкненне Расіі і Германіі да рэвізіі Версаля штурхала іх да супрацоўніцтва, што адлюстравалася ў падпісанні Рапальскага дагавора. У гістарыяграфіі да гэтага часу па-рознаму ацэніваецца ўплыў Рапала на міжнародную сітуацыю, у прыватнасці, на знешнепалітычнае становішча Польшчы. У дадзеным артыкуле мы паспрабуем адказаць на пытанне, у якой ступені рэальнай была пагроза для Польшчы ў сувязі з Рапала і наколькі ўдалай і апраўданай была яе палітыка, накіраваная на раз’яднанне Расіі і Германіі адразу пасля заключэння дагавора.

Прынятае Антантай рашэнне аб скліканні канферэнцыі ў Генуі з удзелам Германіі і савецкай Расіі выклікала значную заклапочанасць у польскіх палітычных колах. Не выключалася, што на канферэнцыі Расія ўздыме пытанне аб польска-савецкай мяжы, якая ў то час яшчэ не была прызна міжнароднай супольнасцю [1, с. 197]. Прызнанне вядучымі дзяржавамі Захаду савецкай Расіі павінна было прывесці і да прызнання імі ўсходняй граніцы Польшчы 1921 г. Падпісаны па выніках нарады ў Рызе прадстаўнікоў РСФСР, Польшчы і прыбалтыйскіх краін 30 сакавіка 1922 г. пратакол уключаў дамоўленасць аб узгодненых дзеяннях у Генуі. У пратаколе гаварылася і аб пажаданасці прызнання РСФСР вядучымі дзяржавамі Захаду [2, с. 146-148]. Такім чынам, абазначыліся агульныя міжнародныя інтарэсы савецкай Расіі і Польшчы. Але, нягледзячы на некаторае пацяпленне ў савецка-польскіх адносінах напярэдадні Генуі, наўрад ці можна казаць аб тым, што ў Маскве разлічвалі на іх устойлівае паляпшэнне. 2 красавіка па шляху ў Геную ў Берлін прыбыла савецкая дэлегацыя на чале з наркамам замежных спраў Г. Чычэрыным, каб працягнуць перамовы аб падпісанні савецка-германскага палітычнага дагавора. Германскі ўрад дэманстраваў сваю незадаволенасць савецкімі крокамі, накіраванымі на зблізжэнне з Польшчай, а таксама не жадаў перад Генуей раздражняць Захад наладжваннем адносін з бальшавікамі і не рашыўся падпісаць дамову з Расіяй у той момант [3, с. 255]. Пасля гэтага савецкая дэлегацыя накіравалася ў Геную.

Адкрыццё Генуэзскай канферэнцыі адбылося 10 красавіка. Па прыбыцці ў Геную польскі міністр замежных спраў К. Скірмунт зрабіў заяву, у якой выказаўся аб польскай пазіцыі на канферэнцыі. Яна зводзілася да наладжвання цеснага супрацоўніцтва з Францыяй і краінамі Малой Антанты [4, с. 27]. Названыя заявы і дзеянні польскага міністэрства замежных спраў пакідалі мала надзей на польска-савецкае супрацоўніцтва падчас канферэнцыі. Між тым, 16 красавіка ў час працы канферэнцыі Расія і Германія падпісалі Рапальскі дагавор. Дагавор прадугледжваў аднаўленне дыпламатычных адносін і адмову ад узаемных прэтэнзій.

Рэакцыя іншых удзельнікаў канферэнцыі на падпісанне Рапальскага дагавора была хуткай і негатыўнай. 18 красавіка адбылася нарада прадстаўнікоў краін Антанты, Малой Антанты, Польшчы і некаторых іншых дзяржаў, на якой абмяркоўвалася сітуацыя, якая склалася ў выніку падпісання савецка-германскай дамовы. К.Скірмунт двойчы выступаў на нарадзе, патрабуючы заняць рашучую пазіцыю ў адносінах да дагавора. Ён матываваў гэта тым, што менавіта Польшча ў выніку Рапала падвяргаецца асабліва вялікай небяспецы. Удзельнікі нарады выпрацавалі ноту германскай дэлегацыі, у якой высунулі два асноўныя абвінавачванні: 1) Германія падрыхтавала Рапальскі дагавор тайна; 2) яна сепаратна вырашыла гэтай дамовай тыя праблемы, для вырашэння якіх была скліканая канферэнцыя і парушыла тым самым канскія ўмовы [5, с. 306].

Што датычыцца першага абвінавачвання, то яно выклікае вялікія сумненні. Скірмунт прызнаваў у інтэрв'ю "Журналь дэ Палонь", апублікаваным 25 красавіка, што польскі ўрад ведаў аб падрыхтоўцы савецка-германскага дагавора [6, ф.418, воп.2, п.10, спр.61, арк.15]. Тое ж самае польскі міністр пацвердзіў, выступаючы ў сойме па выніках Генуэзскай канферэнцыі, калі заявіў, што Польшча "не належала да ліку тых, для каго гэтая дамова з'явілася адкрыццём новага стану рэчаў" [7, с. 157]. З боку Варшавы непераканаўча гучыць і абвінавачванне Германіі ў тым, што яна сепаратна ўрэгулявала свае адносіны з РСФСР. Польшча, падпісаўшы Рыжскі дагавор, зрабіла тое самае. Прымусіць Германію адмовіцца ад Рапальскага дагавора не ўдалося. 21 красавіка быў апублікаваны германскі адказ на ноту саюзнікаў ад 18 красавіка. У ім адзначалася, што савецка-германская дамова накіравана на ўрэгуляванне двухбаковых адносін і не закранае інтарэсы трэціх краін [5, с. 309].

Пераканаўшыся, што Германія не мае намеру адмаўляцца ад Рапальскага дагавора, саюзнікі накіравалі ёй 23 красавіка новую ноту, у якой агаворвалі за сабой права лічыць несапраўднымі і неадбыўшыміся тыя палажэнні савецка-германскай дагавора, якія будуць, на іх думку, супярэчыць існуючым міжнародным дагаварам. К.Скірмунт падкрэсліў, што менавіта польская дэлегацыя была ініцыятарам уключэння ў ноту гэтага палажэння, якое ставіла пад сумненне легітымнасць савецка-германскага дагавора [5, с. 309-310].

Такая актыўная роля польскай дэлегацыі ў Генуі ў справе процідзеяння Рапальскаму дагавору выклікала зваротную негатыўную рэакцыю з савецкага боку. Сярод дзяржаў, якія падпісалі ноты пратэсту, Польшча была адзінай, што мела дыпламатычныя адносіны з РСФСР. У пасланні Скірмунту Чычэрын выказаў здзіўленне савецкага ўрада ў сувязі з удзелам Польшчы ў акцыях пратэсту супраць Рапальскага дагавора. Ён падкрэсліў, што ў польскага ўрада менш усяго падстаў пратэставаць супраць урэгулявання савецка-германскіх адносін шляхам падпісання двухбаковага дагавора, бо яна зрабіла тое самае Рыжскай дамовай. Савецкі наркам папракнуў таксама Скірмунта ў невыкананні Рыжскага пратаколу ад 30 сакавіка 1922 г., паводле якога польскі ўрад узяў абавязак спрыяць юрыдычнаму прызнанню савецкай Расіі. У тым жа духу быў вытрыманы і другі ліст Чычэрына польскаму міністру замежных спраў ад 30 красавіка.

К. Скірмунт у зваротных пасланнях ад 26 красавіка і 3 мая аспрэчыў савецкія абвінавачванні ў невыкананні Рыжскага пратаколу. Ён лічыў, што гэты пратакол не накладвае на Польшчу абавязку падтрымліваць любыя дзеянні савецкай дэлегацыі ў Генуі. Далей польскі міністр заўважаў, што калі б савецкі бок разглядаў Рыжскі пратакол як дакумент, які абавязвае падпісаўшыя яго краіны да ўзгодненых дзеянняў у Генуі, то ён павінен быў запытаць меркаванне польскай дэлегацыі перш, чым падпісваць Рапальскі дагавор. З гэтым довадам можна пагадзіцца, бо Рыжскі пратакол сапраўды абавязваў дзяржавы, якія яго падпісалі, каардынаваць свае дзеянні ў Генуі. Але зразумела, што такі жыццёва важны для яго крок, як падпісанне дагавора з Германіяй, савецкі ўрад не мог ставіць у залежнасць ад пазіцыі Польшчы, нягледзячы ні на якія пратаколы. Тым больш, што польскую пазіцыю лёгка можна было спрагназаваць. Даказваючы далей, што Рапальскі дагавор уяўляе пагрозу для Польшчы і адмоўна ўплывае на польска-савецкія адносіны, Скірмунт указвае на супадзенне па часе падпісання гэтага дагавора са спыненнем выканання Расіяй матэрыяльных абавязка па Рыжскаму дагавору [5, с. 320].

Вядома, апасенні Варшавы ў сувязі з савецка-германскім дагаворам былі далёка не безгрунтоўнымі. Яны знаходзілі пацверджанне ў намерах досыць уплывовых палітычных і вайсковых колаў у Берліне і Маскве. Так, генерал Сект, які ўзначальваў рэйхсвер, выступаў за ліквідацыю незалежнай Польшчы і ўсталяванне непасрэднай мяжы з Расіяй. У мемарандуме, накіраваным канцлеру К.Ю. Вірту 11 верасня 1922 г., ён падкрэсліваў, што з падзеннем Польшчы знікне адзін з галоўных абаронцаў Версалю. Дасягненне гэтай мэты, па яго меркаванню, павінна быць адным з важнейшых кірункаў знешняй палітыкі Германіі, а дамагацца яе варта з дапамогай Расіі [8, с. 39]. Вірт падзяляў гэты пункт гледжання. У гутарцы з прызначаным паслом у Маскву У. Брокдорф-Ранцау ён так сфармуляваў задачы германскай палітыкі пасля Рапала: "З Польшчай трэба канчаць. Мая палітыка імкнецца да гэтай мэты" [3, с. 153].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Польскія палітыкі і вайскоўцы зыходзілі з таго, што Расія і Германія з'яўляюцца асноўнымі праціўнікамі Польшчы на міжнароднай арэне, якія будуць каардынаваць сваю антыпольскую палітыку. У Мемарандуме начальніка польскага генеральнага штаба У. Сікорскага ад 19 студзеня 1922 г., яшчэ да падпісання Рапальскага дагавора, палітыка Польшчы ў адносінах да савецкай Расіі разглядалася ва ўзаемасувязі з палітыкай у дачыненні да Германіі. У якасці важнейшай задачы знешняй палітыкі Польшчы вызначалася аддзяленне Расіі ад Германіі, ізаляцыя і ўнутранае аслабленне гэтых дзяржаў, а таксама "заключэнне ваеннага саюза супраць Германіі і Расіі з усімі іх суседзямі" [9, s.184-188].

Палітыка Масквы ў адносінах да Польшчы адразу ж пасля заключэння Рапальскага дагавора сапраўды стала больш цвёрдай. Расія стала больш упэўнена адчуваць сябе на міжнароднай арэне, разлічваючы на падтрымку Германіі, асабліва на польскім кірунку. 21 красавіка савецкі ўрад накіраваў ноту паверанаму ў справах Польшчы ў РСФСР, у якой запатрабаваў кампенсацыі страт, прычыненых дзеяннямі банд з польскай тэрыторыі [2, с. 264]. Пытанне аб ваенных сутыкненнях на савецка-польскай мяжы паўстала і ў Генуі пры абмеркаванні праблемы аб заключэнні дагавора аб ненападзе. Г. Чычэрын прадставіў Польшчу ў ролі патэнцыяльнага агрэсара. Гэтае выступленне выклікала рэзкі пратэст з боку Скірмунта, які віну за памежныя канфлікты ўсклаў на РСФСР [10, с. 111-112]. Адмоўна сказалася на польска-савецкіх адносінах і тая акалічнасць, што пасля падпісання Рапальскага дагавора Расія спыніла выкананне сваіх абавязакаў па Рыжскаму дагавору, што і адзначыў К. Скірмунт у ноце Г. Чычэрыну ад 3 мая 1922 г. [6, ф.418, воп.2, п.10, спр.61, арк.19]. У маі польскія газеты актыўна абмяркоўвалі сітуацыю з закрыццём доступу польскіх тавараў на савецкі рынак. Яны тлумачылі гэта жаданнем Масквы стварыць лепшыя ўмовы для пранікнення туды нямецкіх тавараў [6, ф.04, воп.2, п.10, спр.61, арк.13]. Таксама былі перарваны польска-савецкія перамовы аб заключэнні гандлёвага дагавора.

Гэтыя факты сведчаць, што савецкая дыпламатыя, пасля заключэння дагавора з Германіяй, адмовілася ад палітыкі, накіраванай на паляпшэнне адносін з Польшчай, якую яна праводзіла перад пачаткам канферэнцыі ў Генуі. У той жа час неабходна адзначыць, што Польшча сваёй палітыкай шмат у чым спрыяла такой змене. Антысавецкія акцыі, здзейсненыя на міжнароднай арэне польскім урадам, спрыялі яшчэ хутчэйшаму і цеснаму збліжэнню паміж Масквой і Берлінам. Гэтае збліжэнне, якое праявілася ў заключэнні Рапальскага дагавора, сапраўды ўяўляла значную пагрозу для Польшчы. Пагроза гэтая заключалася перш за ўсё ў новай палітычнай сітуацыі, якая склалася ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе пасля Рапала. Польшча апынулася ў гэтым рэгіёне ў значнай меры ў ізаляцыі. У той жа час, як уяўляецца, Рапальскі дагавор, асабліва ў першы час, не нёс непасрэднай пагрозы, адэкватнай польскім апасенням. Як справядліва адзначаў польскі гісторык міжваеннага перыяду С. Мацкевіч, Германія і Расія пасля Першай сусветнай вайны не мелі пакуль сіл для знішчэння Польшчы. Але, па яго меркаванню, такая пагроза патэнцыяльна існавала [11, s.51, 193]. Рапала аслабляла Версальскую сістэму, узмацняла пазіцыі названых дзяржаў, якія з'яўляліся галоўнымі сапернікамі Польшчы на міжнароднай арэне. Гэта, безумоўна, было не ў інтарэсах польскай дзяржавы.

Пасля завяршэння Генуэзскай канферэнцыі праблемы, народжаныя Рапальскім дагаворам, працягвалі займаць цэнтральнае месца ў знешняй палітыцы Польшчы. Шматлікія польскія палітычныя дзеячы адзначалі, што іх краіна можа процістаяць, як яны лічылі, аб'яднаным сілам Германіі і Расіі толькі праз умацаванне адносін з саюзнікамі. Польскі пасол у Лондане Врублеўскі, указваючы на небяспеку для Польшчы Рапальскага дагавора, падкрэсліваў, што яна, пры ўмове падтрымкі з боку сваіх саюзнікаў, можа быць паспяховай процівагай савецка-германскаму блоку [6, ф.418, воп.2, п.10, спр.61, арк.121]. Першай у шэрагу гэтых саюзнікаў была Францыя. Выступаючы 25 мая ў Кракаве польскі міністр замежных спраў заявіў, што падтрыманне сяброўскіх адносін з Францыяй складае аснову знешняй палітыкі Польшчы [6, ф.418, воп.2, п.10, спр.61, арк. 162]. У Маскве ў гэты час разглядалі Францыю як галоўнага саперніка на міжнароднай арэне, таму ўсякае імкненне Варшавы падкрэсліць сваё сяброўства з ёй вяло да ўзмацнення антыпольскіх тэндэнцый у палітыцы РСФСР.

Дэманструючы пасля Рапала ўзмацненне антысавецкіх тэндэнцый у сваёй палітыцы, Варшава, з іншага боку, рабіла крокі, накіраваныя на паляпшэнне адносін з Германіяй, раз-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

лічваючы тым самым пашкодзіць савецка-германскаму супрацоўніцтву. Берлін таксама выявіў цікавасць палепшыць адносіны з Польшчай. Справа ў тым, што Рапальскі дагавор адчыняў шырокія магчымасці для развіцця савецка-германскага эканамічнага супрацоўніцтва. Асноўныя транспартныя шляхі, якія злучаюць Расію і Германію, праходзілі праз Польшчу. У гутарцы са Скірмунтам, якая адбылася 25 красавіка ў Генуі, міністр замежных спраў Германіі В. Ратэнау даў зразумець, што немцы згодны пакончыць з эканамічным байкотам Польшчы, але звязваюць гэта са свабодным транзітам германскіх тавараў праз яе тэрыторыю [6, ф.418, воп.2, п.10, спр.61, арк.88]. 15 мая было дасягнута польска-германскае пагадненне па праблеме Верхняй Сілезіі. Паводле яго Польшча ішла на шэраг саступак Германіі [12, с. 178]. Усё ж, як нам уяўляецца, з германскага боку крокі па паляпшэнні адносін з Польшчай мелі чыста тактычны характар. У стратэгічным плане Германія, як і раней, імкнулася да рэвізіі польскіх граніц і нават да поўнай ліквідацыі незалежнай Польшчы. Многія польскія палітыкі разумелі нерэальнасць працяглага і трывалага паляпшэння адносін з Германіяй. Вось што пісаў начальнік польскага генеральнага штаба У.Сікорскі ў Мемарандуме ад 19 студзеня 1922 г.: “Паляпшэнне адносін з Германіяй магчыма толькі пры ўмове дапамогі ёй у рэваншы супраць Францыі і прадстаўлення эканамічных канцэсій. Але гэтае пагадненне было б кароткачасовым і ў рэшце рэшт Польшча апынулася б у нямецкай няволі” [9, s.183]

У канцы лета польская тактыка адносна разбурэння расійска-германскіх цiскоў памяняецца. На Гаагскай міжнароднай канферэнцыі Польшча будзе імкнуцца заняць пазіцыю супрацоўніцтва з савецкай Расіяй. Але гэта супрацоўніцтва было важна для палякаў не само па сабе, а каб адарваць Германію ад Расіі. Польская дыпламатыя перайшла цяпер на антыгерманскія пазіцыі і прыкладала намаганні, каб не дапусціць удзелу Германіі ў Гаагскай канферэнцыі і пазбавіць Расію і Германію ўзаемнай падтрымкі. Але і зближэнне з савецкай Расіяй не атрымалася. Масква ў якасці ўмовы паляпшэння адносін фактычна ставіла адмову Польшчы ад шэрагу прэытэнзій па Рыжскаму дагавору. Гэта добра выявілася ў час візіта ў Варшаву ў пачатку жніўня намесніка наркама замежных спраў М.Літвінава. Польскі бок адхіліў прапанаваны ім “пакт дружбы”, які прадугледжваў перагляд некаторых палажэнняў Рыжскага дагавора. Польскі міністр замежных спраў Нарутовіч падкрэсліў, што пакт аб дружбе павінен абапірацца на выкананне Рыжскага дагавора [7, с. 169]. Спроба польскай дыпламатыі разбурыць савецка-германскае супрацоўніцтва праз зближэнне на гэты раз с савецкай Расіяй не ўдалася.

Такім чынам, Рапальскі дагавор, адкрыўшы шлях для цеснага савецка-германскага супрацоўніцтва на антыверсальскай аснове, ускладняў знешнепалітычнае становішча Польшчы. Польская дыпламатыя з моманту заключэння гэтага дагавора прадпрымала крокі для разбурэння таго, што яна называла “германа-расійскімі геапалітычнымі цiскамі”. Для гэтага яна спрабавала дабіцца паляпшэння адносін то з Германіяй, то з Расіяй. Аднак дабіцца поспеху на гэтым напрамку не змагла. Таксама Польшча імкнулася ўмацаваць свае міжнародныя пазіцыі ва ўмовах Рапала праз умацаванне і стварэнне ваена-палітычных саюзаў, накіраваных супраць Расіі і Германіі. Але гэтымі крокамі яна штурхала сваіх вялікіх суседзяў да яшчэ больш цеснага супрацоўніцтва. Тым самым умацоўваліся тыя самыя геапалітычныя цiскі, разбурыць якія імкнулася Польшча.

**Abstract.** The consequences of the Rappal agreement signing and the reaction of the Polish diplomacy on the Soviet-German pact are studied in the paper. It is shown that Poland became strongly isolated in central Europe, and Germany and Soviet Russia united their efforts in the fight against Versailles Treaty to which Poland owed its rebirth. It is also shown that the attempts to destroy the “German-Russian gripe” became the central element of the Polish policy.

### Літаратура

1. Mikulicz S. Polityczne manewry polskiej dyplomacji przed konferencja w Genui. // Studia z najnowszych dziejow powszynych. – 1963. – T.3. – S.31-45.
2. Документы внешней политики СССР. – М., 1963. – Т.5. – 807 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

3. Kumaniecki J. Wobec ukladu w Rapallo // Z dziejow stosunkow polsko-radzieckich. Studzia i materially. – 1966. – T.2. – S.253-265.

4. Lassowski P. Z dziejow polityki zagranicznej II Rzeczypospolitej – ministrowe Skirmunt, Narutowicz, Skrzynski // Kwartalnik historyczny. – 1989. – № 3. – S.15-51.

5. Материалы Генуэзской конференции. – М., 1922. – 372 с.

6. Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі.

7. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. – М., 1966. – Т.4. – 559 с.

8. Rosenfeld G. Stosunki polityzny polsko-niemieckie po Rapallo i Lokarno // Kwartalnik historyczny. – 1963. – № 1. – S.26-48.

9. Dokumenty z dziejow polskiej polityki zagranicznej 1918 – 1939. T.1-2. – Warszawa, 1989. – T.1.

10. Kumaniecki J. Polska i Rosja Radziecka na konferencji w Genui // Studia z dziejow ZSRR i Europy Srodkowej. – 1969. – T.5. – S.102-128.

11. Mackiewicz S. Historja Polski ot 11 listopada 1918 do 17 wrzesnia 1939 r. – Wroclaw, 1986.

12. Фарбман Н. В. К вопросу об антипольской политике германского империализма в 1918 – 1922 годах // Германская восточная политика в новое и новейшее время. – М., 1974.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило __.__.09

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ